обучающихся, запросов государства, сообщества работодателей и самого студента [3].

Творческое саморазвитие преподавателя в рамках рассмотренных модулей создаст предпосылки для индивидуализации обучения обучающихся посредством учета их потребностей и личностных возможностей, вовлечения студентов в научно-исследовательскую деятельность вуза, что обеспечит повышение качества высшего образования.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. Попов, А. И. История становления и тенденции развития олимпиадного движения по теоретической механике: монография / А. И. Попов. – Тамбов: Изд-во Тамб. гос. техн. ун-та, 2010. – 136 с.
2. Молоткова, Н. В. Методология профессионального становления преподавателя-исследователя в техническом вузе: учебное пособие / Н. В. Молоткова, А. И. Попов. – Тамбов: Издательский центр ФГБОУ ВО «ТГТУ», 2019. – 96 с.
3. Молоткова, Н. В. Педагогическое сопровождение творческого саморазвития студента в условиях цифровизации образования: учебное пособие / Н. В. Молоткова, А. И. Попов. – Тамбов: Издательский центр ФГБОУ ВО «ТГТУ», 2019. – 80 с.


УДК 93/94:63(476)

# З ГІСТОРЫІ БУДЫНКА ГРОДЗЕНСКАГА РЭАЛЬНАГА ВУЧЫЛІШЧА

**Радзюк А. Р., Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Гродзенскае рэальнае вучылішча, заснаванае ў далёкім 1907 г., мае апасродкаванае дачыненне да аграрнага ўніверсітэта. Менавіта ў будынку вучылішча ў 1951 г. пачынаў сваю гісторыю сельскагаспадарчы інстытут, а сёння тут размяшчаецца біятэхналагічны корпус універсітэта.

Актуальнасць дадзенага даследавання відавочна. Яна вынікае хаця б з таго, што перад уваходам у корпус універсітэта вісіць шыльда, якая інфармае, што будынак з’яўляецца гісторыка-архітэктурнай каштоўнасцю, ўзведзенай у 1907 г. Гэтая ж дата фігуруе ва ўсіх даследаваннях, прысвечаных гродзенскай архітэктуры, уключаючы найбольш аўтарытэтнае выданне *«Бібліяграфія Гарадзенскіх вуліц. Ад фартоў да Каложы»* (Гродна, 2012). Разам з тым, на фасадзе будынка з боку вуліцы 1-га Мая выразна відаць лічбы *1913*. Якая з гэтых дат правільная?



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Зварот да архіўных крыніц засведчыў, што Гродзенскае рэальнае вучылішча было адкрыта 26 жніўня 1907 г. У 1912 г. яму было нададзена імя *«цэсарэвіча Аляксея»*. Уласнага будынку на той час дадзеная навучальная ўстанова не мела. Ініцыятарам яго ўзвядзення выступіў дырэктар вучылішча В. Лідэрс.

Першапачатковы праект новай камяніцы, які прапанаваў архітэктар Срока, быў уладамі адкінуты. Паўторнае складанне праекта было даручана архітэктару віленскай навучальнай акругі Валансевічу. Асноўнымі падрадчыкамі пры ўзвядзенні новага корпусу вучылішча выступілі віленскія мяшчане Я. Разэнгаўз і Г. Дыслер. Натуральна, што большасць работ выконвалася мясцовымі будаўнікамі. За іх ажыццяўленнем назірала адмысловая будаўнічая камісія, якая правярала іх адпаведнасць і якасць, а таксама зацвярджала сметы за той ці іншы этап выкананых работ.

Як адзначала мясцовая прэса, для будынка было абрана адно з лепшых месцаў у горадзе – Новы Свет. «Паблізу будынка – разлеглыя зяленыя палі і сады», – пісалі газеты. Закладка вучылішча адбылася 29 красавіка 1912 г., а ўжо 11 верасня 1913 г. пад гукі аркестра вучні і выкладчыкі ўрачыста пераехалі ў новы корпус.

Будынак быў узведзены ў стыле ампір. Ён складаўся з дзвюх частак. Першая з іх, двухпавярховая, была адведзена пад вучэбны корпус. Тут былі размешчаны хімічны, фізічны (які налічваў большай за 1000 разнастайных прыбораў), прыродны і гісторыка-геаграфічны кабінеты, малявальны і чарцёжны клас, вучнёўская і фундаментальная бібліятэкі. Акрамя таго, тут на першым паверсе знаходзілася гімнастычная зала. Яна была акурат у тым месцы, дзе сёння размешчаны спартыўны зал – найстарэйшы ў горадзе, а можа, і ва ўсёй Беларусі. На другім паверсе, там дзе зараз актавая зала № 2, знаходзілася дамавая царква вучылішча. Дарэчы, элемент рэлігійнага аздаблення ў выглядзе крыжа на вітражах тут захаваўся да сённяшніх дзён. Што праўда, гэты крыж каталіцкі можа сведчыць аб тым, што ў міжваенны час, калі ў будынку дзейнічала гімназія імя А. Міцкевіча, гэты блок выкарыстоўваўся пад хатні касцёл пры гімназіі.

У будынку былі прадугледжаны сучасныя выгоды. Замест пячнога ацяпленне тут дзейнічала паравое. Дарэчы, у аўдыторыі № 27 па сенняшні дзень захаваўся радыятар імаверна з тых часоў (найстарэйшы ў Гродне!). Адпаведныя кабінеты і лабараторыі былі абсталяваныя электрычнымі вентылятарамі. Прыбіральні знаходзіліся ў памяшканні, а не на вуліцы. Асноўныя лесвіцы былі аздоблены мазаікай, якая захавалася да нашых дзён.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГАУ

За сродкі мясцовых уладаў у асобнай невялікай вежы была абсталявана абсерваторыя. Адмысловы жалезны купал, які паварочваўся пры дапамозе адпаведных механізмаў, быў выраблены ў Варшаве. Фірма-вытворца «Гостынскій & К°» займалася яго мантажом на будынку вучыльні. Праўда, тэлескопу на момант адкрыцця вучэбнай установы там не было.

Другая частка будынку – трохпавярховая камяніца – прызначалася пад кватэры педперсаналу. Толькі пад апартаменты дырэктара тут было адведзена шэсць пакояў.

Першапачатковая смета ўсіх работ з матэрыяламі склала 176 тыс. руб. Пры гэтым прыкладна $^{1}/_{3}$ гэтай сумы асігнаваў горад. Таксама ён выдзяляў пляц пад будынак (коштам каля 40 тыс. руб.). Канчатковыя расходы склалі каля 200 тыс. руб. Асноўныя сродкі на яго пабудову паходзілі з сум Міністэрства народнай асветы.

Новы будынак выкарыстоўваўся рэальным вучылішчам толькі адзін навучальны год. Ужо ўлетку 1914 г. ён быў рэквізаваны пад патрэбы вайсковага шпіталя. У лютым 1915 г. вучылішча было вымушана эвакуавацца: спачатку ў Слонім, а пасля ў Калугу, дзе яно яшчэ некаторы час працягвала сваю дзейнасць.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 6.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 18.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 19.
4. НГАБ у Гродне. Ф. 41, воп. 1, спр. 28.
5. Наше утро 1913 год. № 176, № 191, № 194, № 201, № 248.
6. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад фартоў да Каложы. – Гродна, 2012. – С. 262-263.

УДК 947.6

# ДЫВЕРСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГЕРМАНСКІХ СПЕЦСЛУЖБАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1943-1944 ГГ.

**Рыбак Н. А.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Нямецка-фашысцкія захопнікі напрацягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны рыхтавалі дыверсантаў і тэрарыстаў для закідвання іх у савецкі тыл. Такая праца актывізавалася на заключным этапе вайны.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГАУ